Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

15 КАСТРЫЧНІКА 2008 г.
СЕРАДА
№ 195
(26308)

Кошт 500 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.


## Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў праверыць факты скажэння статыстычных даных у час уборачнай кампаніі

**У сувязі з завяршэннем сельскагаспадарчай уборачнай кампаніі, апошні этап якой праходзіць у няпростых умовах надвор'я, кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка даручыў Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і Камітэту дзяржаўнага кантролю неадкладна вывучыць стан спраў з уборкай ураджаю.**

Прэзідэнт запатрабаваў дасканала прааналізаваць адпаведнасць прадастаўляемых статыстычных даных рэальнай сітуацыі на месцах. Да вінаватых за правалы ў рабоце, скажэнне статыстычнай справаздачнасці будуць прыняты самыя строгія меры. На працягу тыдня кіраўніку дзяржавы павінна быць далажана аб сітуацыі ў рэгіёнах.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## Дзяржкантроль супраць прыпісак

**Камітэт дзяржаўнага кантролю на працягу тыдня правядзе рэйдавыя праверкі ходу завяршэння ўборачных работ. Паводле звестак прэс-службы камітэта, з гэтай мэтай у Мінску і абласных цэнтрах створаны рабочыя групы, якія ва ўсіх рэгіёнах краіны прааналізуюць сітуацыю ў аграрным сектары.**

Пільная ўвага будзе нададзена льнаводчым раёнам, сельгасарганізацыям, якія не завяршылі ўборку агародніны і караняплодаў, пытанням стварэння кармавых запасаў для жывёлагадоўчай галіны, у прыватнасці, нарыхтоўцы кукурузы на кармы і сілас. Будзе таксама вывучана пытанне выкарыстання энерганасычанай тэхнікі, гатоўнасці гаспадарак да працы ў асенне-зімовы перыяд. Камітэт дзяржкантролю мае намер уважліва прааналізаваць дакладнасць статыстычных даных, што падаюць сельгасарганізацыі і райсельгасхарчы, якія, на жаль, не заўсёды адпавядаюць фактычнаму стану спраў.

**Сяргей ПАЛІНІН.**

## Беларусь мае намер супрацоўнічаць з CITIC Group у сферы фінансаў, машынабудаванні, горадабудаўніцтве, спорце і турызме

**Кітай з'яўляецца важным знешнеэканамічным партнёрам Беларусі, і наша краіна імкнецца да актывізацыі двухбаковых гандлёва-эканамічных адносінаў. У прыватнасці, Беларусь мае намер развіваць супрацоўніцтва з кітайскай карпарацыяй CITIC Group у фінансавай сферы, машынабудаванні, горадабудаўніцтве, спорце і турызме. Зацікаўленасць у гэтым пацвердзіў 14 кастрычніка Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы са старшынёй праўлення карпарацыі Кун Данем.**

Група кампаній CITIC Group (China International Trust and Investment Corporation) — адно з найбуйнейшых дзяржаўных прадпрыемстваў Кітая. Агульныя капіталы CITIC Group складаюць больш як $122 млрд. У 2007 годзе сумарныя актывы карпарацыі перавысілі $200 млрд. Тавараабарот склаў больш як $20 млрд, а прыбытак дасягнуў $4 млрд.

Аляксандр Лукашэнка лічыць неабходным як мага хутчэй пачаць рэалізацыю праектаў з кітайскай карпарацыяй CITIC Group у сферы вытворчасці цэменту. «Нашаму супрацоўніцтву пакладзены ўжо добры пачатак. Вы будзеце мадэрнізаваць у нас цэментныя заводы, будаваць новыя лініі. Нам неабходна як мага хутчэй пачаць рэалізацыю гэтых праектаў і пры гэтым зняць усе пытанні па якасці абсталявання і асаблівасцях нашай сыравіны», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Як адзначыў старшыня праўлення кітайскай карпарацыі Кун Дань, дзякуючы сумесным намаганням праект у цэментнай галіне рухаецца вельмі хутка, намнога хутчэй за іншыя праекты. Ён таксама дадаў, што кітайскі бок высока цэніць і з адказнасцю ставіцца да супрацоўніцтва з Беларуссю.

У сваю чаргу Прэзідэнт падкрэсліў, што Кітай з'яўляецца важным гандлёвым партнёрам Беларусі. Ужо ў гэтым годзе аб'ём узаемнага гандлю перасягне $1 млрд. Аднак кіраўнік дзяржавы лічыць недастатковым такі ўзровень тавараабароту. На сустрэчы Аляксандр Лукашэнка таксама адзначыў дасягненні кітайскай карпарацыі ва ўзвядзенні ўнікальных спартыўных аб'ектаў. Наглядны прыклад таму — будаўніцтва галоўнай алімпійскай арэны Пекіна «Птушынае гняздо». «Напрамкаў супрацоўніцтва многа. Хацелася б ператварыць іх у канкрэтныя дамоўленасці і праекты ўжо ў гэты ваш прыезд», — сказаў Прэзідэнт.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

Ва Ўрадзе

## Жыллёва-камунальная гаспадарка да зімы гатовая...

**Прэм'ер-міністр Сяргей Сідорскі запатрабаваў устараніць асобныя недахопы ў запланаваных Урадам мерапрыемствах да пачатку ацяпляльнага сезона з тым, каб не ўзнікала ніякіх праблем сёлетняй зімой. «Да 15 кастрычніка павінна быць поўная гатоўнасць да пачатку ацяпляльнага сезона ў краіне», — падкрэсліў прэм'ер на ўчарашнім пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў, на якім разглядаліся пытанні падрыхтоўкі народнай гаспадаркі рэспублікі да работы ў асенне-зімовы перыяд 2008/2009 года.**

Сярод праблемных пытанняў, у прыватнасці, намеснік міністра эканомікі Анатоль Філонаў узгадаў пра тое, што ёсць адставанні па афармленні да 15 кастрычніка актаў і пашпартоў гатоўнасці цеплакрыніц і спажыўцоў. Так, напрыклад, да 10 кастрычніка было зарэгістравана ўсяго 85,6 працэнта пашпартоў гатоўнасці. У сваю чаргу Сяргей Сідорскі заявіў, што ў выпадку нейкіх «ЧП» у рабоце цепласетак «будуць персанальна адказваць чыноўнікі, якія прынялі гэтыя пашпарты». Акрамя таго, кіраўнік Урада даручыў разабрацца з яшчэ адным важным пытаннем — сітуацыяй вакол выбаркі торфабрыкетаў. Так, у заданні на гэты год прадугледжаны запасы торфабрыкетаў у аб'ёме 1046 тысяч тон. Разам з тым на пачатак гэтага месяца аблвыканкамамі выбрана толькі каля паловы ад задання. Таму прэм'ер загадаў абласцям дакладна вызначыцца з патрэбамі ў гэтым відзе паліва арганізацый і насельніцтва на сезон, а лішкі торфу экспартаваць. І дадаў, што ў гэтым пытанні патрэбна браць таксама ў разлік і максімальна магчымы перавод цеплакрыніц на мясцовыя віды паліва.

**(Заканчэнне на 5-й стар.)**

## Перавага — за рублёвымі дэпазітамі

**«Звязда» ўжо інфармавала сваіх чытачоў, што ў рэспубліцы па-ранейшаму фіксуецца рост укладаў насельніцтва ў беларускіх банках. Пра гэта сведчаць і апошнія звесткі Нацыянальнага банка Беларусі, атрыманыя нашай газетай.**

Так, за студзень—верасень гэтага года ўклады насельніцтва павялічыліся больш як на 2,7 трыльёна рублёў, ці амаль на 26 працэнтаў. У пераразліку на нацыянальную валюту яны перавысілі 13,3 трыльёна рублёў. Рублёвыя дэпазіты на пачатак кастрычніка склалі каля 8,9 трыльёна рублёў, павялічыўшыся з пачатку года на 30,5 працэнта, а ў замежнай валюце — звыш 2,1 мільярда долараў ЗША ў эквіваленце (рост 19,9 працэнта). Нагадаем і тое, што з сённяшняга дня стаўка рэфінансавання складае ўжо 10,75 працэнта (яна ўзрасла на 0,25 працэнта): гэта павысіць даходнасць па дэпазітах у нацыянальнай валюце і стварае больш прывабныя ўмовы для захоўвання грошай ва ўкладах, асабліва з доўгімі тэрмінамі іх размяшчэння.

Між іншым, паводле апытання на сайце www.zviazda.by наконт таго, якой валюце для захоўвання грошай аддаюць перавагу людзі, з 27 удзельнікаў 10 «прагаласавалі» за амерыканскі долар. Астатнія адказы размеркаваліся наступным чынам: 6 чалавек лічаць за лепшае захоўваць грашовыя сродкі ў беларускіх рублях, 1 — у расійскіх, 5 — у еўра, а 5 чалавек увогуле не робяць «заначкі на «чорны дзень».

**Ігар ГРЫШЫН.**


белагропромбанк
традиции будущего

С 15 октября 2008 г. на основании постановления Правления Национального банка Республики Беларусь от 07.10.2008 № 143, **размер ставки рефинансирования установлен в размере 10,75 процента годовых.**

В соответствии с условиями договоров ОАО «Белагропромбанк» сообщает об увеличении процентных ставок по договорам банковского вклада «Универсальный», заключенных в период с 02.08.2004 по 05.03.2006 и «Сберегательный», заключенных в период с 25.10.2004 по 05.03.2006 **на 0,25 процентного пункта** с 15.10.2008 г.

КОНТАКТ-ЦЕНТР БАНКА 136

www.belapb.by

*Лицензия на осуществление банковской деятельности от 27.10.2006 № 2, выдана Национальным банком Республики Беларусь.*


Жывая зямля

## ВАСІЛЁВА БЯРОЗА



*Моцныя абдымкі двух дрэў жыхар вёскі Плянта Салігорскага раёна **Васіль ТАТАРЫЦКІ** заўважыў зусім выпадкова — за агародамі было месца, дзе звычайна стаялі вясковыя стагі сена, а пад іх, як правіла, кладуць галінкі дрэў. Побач рос самасейны бярэзнічак, мала чым адметны і цікавы, з якога секлі дубцы ўсе, каму хочацца. Там-сям узвышаліся хвойкі. Васіль падаўся ў гусцейшыя зараснікі, каб нешта выбраць, пачаў секчы і наткнуўся на гэтае дзіва, ажно ахнуў: сасна двойчы абвітая тонкай бярозкай. Незвычайную навіну прынёс дадому.*

*— Я абсек гэтае месца вакол, каб неяк вылучыць і лёгка было знаходзіць, і прасіў аднавяскоўцаў не секчы і не ламаць, — прыгадвае 71-гадовы жыхар. — А ўжо сваіх шасцярых дзяцей як папярэдзіў!..*

*Ён нават не памятае, калі дакладна здарылася гэтае адкрыццё, гадоў дваццаць пяць, лічыць, ужо мінула.*

*Пазней палявая сцяжына ператварылася ў шырокую дарогу дачнікаў, а «закаханая парачка» апынулася якраз на яе абочыне. З невядомагаляснога дзіва сасна і бяроза перараслі ў сімвал-помнік: тут спыняюцца, робяць фотаздымкі, спецыяльна прыязджаюць падзівіцца, прывозяць дзяцей і ўнукаў. Розныя бываюць «абдымкі» і выкрунтасы ў дрэў, але такога серпанціну аднаго камля вакол другога нават у агромністым белавежскім лясным масіве не выяўлена. Дарожнікі паклалі абапал некалькі валуноў для дэкарацыі і на ўсякі выпадак для абароны, бо якраз тут дарога робіць пятлю. Васіль Канстанцінавіч цешыцца, што яго знаходка стала знакамітасцю і ёй нічога не пагражае (а ўжо як рады яго мінскія ўнукі Андрэй і Аляксандр!). А ў тым, што яна — сапраўднае ўпрыгажэнне зямлі, ніколі не сумняваўся, хоць і не лесавод ён, не біёлаг, не мастак. А звычайны вясковы трактарыст, дарэчы, з 45-гадовым стажам. Насамрэч, што каштавала яму некалі неабачліва махнуць вострай сякерай, ці проста не надаць значэння ўбачанаму. Каб жа ўсе ставіліся да прыроды з Васілёвымі пачуццямі, колькі б цудаў яшчэ радавала нашы вочы.*

**Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.**

Твае правы

## НАСТАЎНІК — НЕ МАЛЯР

**Школа — гэта не толькі вучань, але і настаўнік. І, зразумела, што кожны з іх мае не толькі свае абавязкі, але і правы. Між тым, колькі трэба працаваць настаўніку падчас канікулаў, ці павінен персанал школы выконваць рамонтныя работы, ад чаго залежаць прэміі і як адбываецца перавод на палову стаўкі? Па адказы на гэтыя пытанні мы вырашылі звярнуцца да загадчыка аддзела прававой абароны — галоўнага прававога інспектара працы Беларускага прафесійнага саюза работнікаў адукацыі і навукі Ларысы Васільеўны МАНЮК.**

### НЯМА ЗАНЯТКАЎ. ЁСЦЬ РАБОТА?

*Канікулы — законны адпачынак для школьнікаў. Што ж да настаўнікаў, то звычайна тут узнікаюць пытанні. Ці павінны педагогі прысутнічаць на сваіх працоўных месцах у час, калі няма заняткаў? І калі павінны, то колькі?*

— У пачатку навучальнага года кожнаму настаўніку вызначаецца аб'ём педагагічнай работы, у які ўваходзяць непасрэдна вучэбныя ўрокі, час правядзення якіх адпавядае раскладу ўрокаў (ён зацвярджаецца загадам дырэктара па ўзгадненні з прафкамам), а таксама гадзіны дадатковага кантролю і арганізацыйна-выхаваўчай работы ў адпаведнасці з графікам работ (зноў-такі зацвярджаецца загадам дырэктара па ўзгадненні з прафкамам). Пры гэтым, калі на час канікулаў дырэктар не выдае асобнага загада аб рэжыме работы, настаўнік, як звычайна, павінен выходзіць на сваё працоўнае месца паводле свайго вучэбнага раскладу, графіку работ. Калі ж асобны загад усё ж выдаецца, то выхады ўжо робяцца ў адпаведнасці з ім. Аднак у любым выпадку колькасць працоўных гадзін у вучэбны і канікулярны час у настаўніка павінна быць аднолькавай.

Дарэчы, на вызначэнне рэжыму работы ў канікулярны час работнікам установы адукацыі дырэктар мае поўнае права. Галоўнае, каб педагагічныя работнікі былі азнаёмленыя з загадам.

### ЗГОДА З ДАДАТКОВЫМІ ГРАШЫМА

*Афармленне кабінета, падрыхтоўка планаў, самаадукацыя — справы на канікулах звычайныя. Аднак не сакрэт: часта ў свабодны ад заняткаў час педагагічным работнікам прапануюць «дадатковую нагрузку». Скажам, добраўпарадкаваць тэрыторыю, патынкаваць столь, пафарбаваць сцены ці нават... папрацаваць у мясцовым сельгаспрадпрыемстве.*

— Мне менш за ўсё хацелася б абвінавачваць дырэктараў, часта яны знаходзяцца ў безвыходнай сітуацыі — фінансавання на тыя ж рамонты недастаткова, а рабіць іх трэба. — Але неабходна падкрэсліць: артыкул 20 Працоўнага кодэкса вызначае, што наймальнік не мае права патрабаваць выканання работ, не прадугледжаных у працоўным дагаворы. Як вядома, у кожнага настаўніка павінна быць службовая інструкцыя, якая ў сваю чаргу распрацоўваецца на падставе тарыфна-кваліфікацыйнага даведніка. Такіх жа абавязкаў настаўніка, як рамонт памяшканняў, прыбіранне тэрыторыі ці работы на прышкольным участку, у даведніку няма. Словам, прымусіць займацца ўсім гэтым педагога ніхто не можа. Разам з тым, калі падобныя работы прапануюцца наймальнікам і настаўнік на іх пагаджаецца, варыянт выканання «дадатковых» абавязкаў магчымы. Аднак толькі за дадатковую аплату. Заўважу, што гаворка ідзе аб невяліківх грашах, і тым не менш тут важны сам факт.

Калі настаўнік згодны выконваць віды работ, якія не ўваходзяць у яго службовыя абавязкі, з ім складаецца асобны дагавор. Апроч таго, наймальнікам выдаецца загад, з якім знаёмяць адпаведнага работніка. У абавязковым парадку праводзіцца навучанне тэхніцы бяспекі, інструктаж па прафесіях і відах работ, праверка ведаў, патрабуецца абавязковы медагляд на прафесійны допуск, работнік забяспечваецца сродкамі індывідуальнай абароны, у прафілактычных мэтах павінна выдавацца малако.

Трэба таксама падкрэсліць, што настаўніку нельга даручаць работы, якія патрабуюць адпаведнай прафесійнай падрыхтоўкі. Здаецца, што пафарбаваць ці паклеіць шпалерамі сцены — справа не такая ўжо і хітрая. Аднак спецыфічная і рызыкоўная. Бо, на жаль, пры выкананні гэтых і іншых работ ва ўстановах адукацыі маюць месца няшчасныя выпадкі.

Што ж да абслуговага персаналу школы, то тут малюнак наступны. — У правілах унутранага працоўнага распарадку ўстаноў адукацыі ўстанаўліваецца, што падчас канікулаў пры неабходнасці абслуговы персанал можа прыцягвацца да дробных рамонтаў. Аднак зноўтакі са згоды саміх работнікаў і за дадатковую аплату.

**(Заканчэнне на 5-й стар.)**

### ТАКІЯ ВОСЬ «АБАРОНЦЫ»...

Двое жыхароў Кобрына былі затрыманыя, калі спрабавалі з тэрыторыі аўтабазы вывезці паўтары тоны авіяпаліва. Газу ім прадалі трое вайскоўцаў, якія павінны былі тое паліва ахоўваць. Кожнаму далі па тры гады «хіміі».

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

### АБМЕННЫ ПУНКТ У КІШЭНІ ВАЛЮТЧЫКАЎ

**На Бабруйскім рынку 11 кастрычніка міліцыя затрымала валютчыкаў: 40-гадовы мужчына і 51-гадовая жанчына праводзілі незаконныя валютныя аперацыі.**

Пры затрыманні ў іх канфіскавалі вялікую суму грошай: 13 мільёнаў беларускіх рублёў, 135 тысяч расійскіх рублёў, 250 украінскіх грыўняў, 1650 долараў ЗША і 150 еўра. Верагодна, што да гэтай сумы валютчыкам давядзецца заплаціць яшчэ і прыстойныя штрафы.

**Алена КАЗЛОВА.**

### «Дарыдзе» за зрыў матча з «Гранітам» залічана паражэнне

За зрыў матча з мікашэвіцкім «Гранітам» 12 кастрычніка ў вышэйшай лізе чэмпіянату Беларусі па футболе камандзе «Дарыда» з Мінскага раёна залічана тэхнічнае паражэнне з лікам 0:3, паведамляе БЕЛТА. Прычынай небывалага дэмаршу «Дарыды» стала прадузятае, па меркаванні яе кіраўніцтва, стаўленне да каманды суддзяў падчас матчаў нацыянальнага першынства. Дысцыплінарны камітэт Асацыяцыі «Беларуская федэрацыя футбола» на сваім паседжанні разгледзеў інцыдэнт і прысудзіў «Дарыдзе» тэхнічнае паражэнне. Пры гэтым былы генеральны дырэктар клуба Уладзімір Дзялендзік, які зняў з сябе паўнамоцтвы напярэдадні, атрымаў 6-месячную дыскваліфікацыю і штраф у памеры 500 базавых велічынь. Пакараны і дырэктар клуба Яўген Шабуня, які таксама дыскваліфікаваны на паўгода і аштрафаваны на 100 базавых велічынь. У выпадку паўторнага зрыву футбольнага матча «Дарыдай» дысцыплінарны камітэт будзе замаўляць перад выканкамам АБФФ аб выключэнні клуба з ліку ўдзельнікаў чэмпіянату Беларусі.


*Главное управление Национального банка Республики Беларусь по г. Минску и Минской области*

имеет возможность

**РЕАЛИЗОВАТЬ ЗАПАСНЫЕ ЧАСТИ И МАТЕРИАЛЫ К АВТОМОБИЛЯМ ОТЕЧЕСТВЕННОГО ПРОИЗВОДСТВА СТАРЫХ МАРОК УАЗ, ВАЗ, ГАЗ И РАФ.**

УНП 100678894 Телефон для справок 8 (017) 223 11 08.


РОЗГАЛАС — АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

### У КРАДЗЯЖЫ ПАДАЗРАЕЦЦА... РЭКТАР!

**Папярэднім расследаваннем ГУУС Мінгарвыканкама па матэрыялах упраўлення па барацьбе з карупцыяй і эканамічнымі злачынствамі ўзбуджана крымінальная справа ў дачыненні да рэктара адной з устаноў адукацыі.**

Паводле папярэдняй інфармацыі, падазраецца 51-гадовы мінчанін у тым, што са студзеня 2005 па май гэтага года, злоўжываючы службовым становішчам, ён учыніў крадзеж 21 мільёна 700 тысяч рублёў.

**Дзмітрый СТАНКОВІЧ.**

### ТАБЛЕТКІ — НЕ ЦАЦКІ

Бацькоўская нядбайнасць і цікавасць дзяцей да розных рэчаў, часам небяспечных, сталі прычынай адразу двух здарэнняў у Магілёўскай вобласці. Абодва адбыліся 12 кастрычніка і звязаны з клафелінам — лекамі, якія выкарыстоўваюцца для зніжэння артэрыяльнага ціску. З вёскі Пацава Слабада ў Бабруйскую цэнтральную бальніцу даставілі 2,5-гадовага хлопчыка, які «пачаставаўся» клафелінам. Бацькі своечасова спахапіліся і нават паспелі «выдраць» некалькі таблетак прама з рота. Пасля прамывання і кропельніц у дзіцячай рэанімацыі малы адчувае сябе нармальна. Дзяўчынка 2007 года нараджэння з Быхава таксама з'ела таблетку клафеліну. Яна правяла суткі ў рэанімацыі, а цяпер выпісана дадому пад нагляд педыятра. Урачы гавораць, што атручэнне такімі сур'ёзнымі лекамі, як клафелін — справа вельмі небяспечная, здараліся і смяротныя выпадкі. Таму яны настойліва раяць паклапаціцца, каб усе лекавыя сродкі захоўваліся ў месцы, недаступным для дзяцей.

**Алена КАЗЛОВА.**

Гульня № 1

## ГЛЕБ НЕ ПРЫЕДЗЕ?



**Галоўны трэнер нацыянальнай зборнай Беларусі па футболе Бернд Штанге напярэдадні матча адборачнага турніру чэмпіянату свету супраць каманды Англіі ў інтэрв'ю «Прэсболу» падзяліўся думкамі наконт адказнага паядынку ў Мінску.**

У прыватнасці трэнер заўважыў: «Госці ўпэўненыя ў сабе: яны ведаюць, што ў выніку перамогі пуцёўка ў ПАР у іх на 50 працэнтаў у кішэні. Але я паўтараю нашым гульцам, каб яны нікога не баяліся. Зразумела, калі параўноўваць Фердзінанда, Лампарда, Руні з Верхаўцовым, Пуцілам і Кутузавым, то суадносіны сілаў не на нашу карысць. У англічан вялізны вопыт гульні на самым высокім узроўні, і ў тэорыі яны мацнейшыя за нас па ўсіх паказчыках. Але ніякай боязі перад зоркамі ў нас не павінна быць».

У гульні з англічанамі беларусы не змогуць разлічваць на свайго капітана Аляксандра Глеба — паўабаронца «Барселоны» так і не паспеў аднавіцца пасля траўмы. Штанге занепакоены стратай хаўбека: «Англічане вельмі задаволеныя, што Глеб не выйдзе на поле, яны яго добра ведаюць і таму апасаюцца. Наш капітан хацеў бы прыляцець у Мінск — няхай нават не гуляць, а проста маральна падтрымаць партнёраў. Але ў «Барселоне» адмаўляюцца адпускаць Аляксандра, баяцца, што я выпушчу яго на поле. Чакаю тэлефанавання Гвардыёлы — я хацеў паразмаўляць з ім, але ўсе апошнія дні яго тэлефон упарта маўчаў. Нават сам Глеб не мог датэлефанавацца свайму трэнеру. Так што, хутчэй за ўсё, ён не прыедзе ў зборную».

Зборная Англіі правядзе адборачны матч чэмпіянату свету-2010 супраць каманды Беларусі таксама без двух ключавых гульцоў. На поле мінскага стадыёна «Дынама» не выйдуць абаронцы Джон Тэры і Эшлі Коўл. У Тэры, які прапусціў папярэднюю гульню з Казахстанам, праблемы са спінай, а Коўла непакоіць падкаленнае сухажылле.


БПС-БАНК

*Бульвар имени Мулявина, 6, 220005, г. Минск-5*
*Телефон (8 017) 289 46 06, факс 210 03 42,*
*e-mail: inbox@bpsb.by, Интернет: www.bpsb.by*


### Открытое акционерное общество «Белпромстройбанк»

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 октября 2008 года

*(в миллионах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | На 01.10.2008 | На 01.10.2007 |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 1 | 201863,6 | 123819,4 |
| 3 | Средства в Национальном банке | 1102 | 2 | 243433,7 | 184010,5 |
| 4 | Ценные бумаги | 1103 | | 292232,2 | 129106,8 |
| | для торговли | 11031 | 3 | 53415,1 | 0,0 |
| | удерживаемые до погашения | 11032 | 3,1 | 72283,4 | 35157,6 |
| | в наличии для продажи | 11033 | 3,2 | 166533,7 | 93949,2 |
| 5 | Кредиты и другие средства в банках | 1105 | 4 | 305566,4 | 180154,0 |
| 6 | Кредиты клиентам | 1106 | 5 | 3089439,1 | 2137718,1 |
| 7 | Долгосрочные финансовые вложения | 1107 | 6 | 1624,4 | 1635,3 |
| 8 | Основные средства и нематериальные активы | 1108 | 7 | 173470,2 | 144233,5 |
| 9 | Прочие активы | 1109 | 8 | 46571,7 | 26865,6 |
| 10 | ИТОГО активы | 110 | | 4354201,3 | 2927543,2 |
| 11 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 12 | Средства Национального банка | 1202 | 9 | 66211,8 | 46324,2 |
| 13 | Кредиты и другие средства банков | 1205 | 10 | 487110,5 | 496529,2 |
| 14 | Средства клиентов | 1206 | 11 | 3123251,0 | 1952651,7 |
| 15 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1208 | | 105708,5 | 18210,8 |
| 16 | Прочие обязательства | 1209 | 12 | 90120,0 | 46587,5 |
| 17 | ВСЕГО обязательства | 120 | | 3872401,8 | 2560303,4 |
| 18 | **КАПИТАЛ** | | | | |
| 19 | Уставный фонд | 1211 | 13 | 194133,3 | 139866,6 |
| 20 | Эмиссионный доход | 1212 | | 0,0 | 0,0 |
| 21 | Резервный фонд | 1213 | | 29144,8 | 21063,4 |
| 22 | Накопленная прибыль | 1214 | 14 | 135671,2 | 97872,0 |
| 23 | Фонд переоценки статей баланса | 1215 | 15 | 122850,2 | 108437,8 |
| 24 | ВСЕГО капитал | 121 | | 481799,5 | 367239,8 |
| 25 | ИТОГО обязательства и капитал | 12 | | 4354201,3 | 2927543,2 |
| 26 | **ТРЕБОВАНИЯ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА НА ВНЕБАЛАНСОВЫХ СЧЕТАХ** | | | | |
| 27 | Требования | 1301 | 16 | 2836428,1 | 2104240,1 |
| 28 | Обязательства | 1302 | 17 | 1790453,9 | 956174,8 |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 октября 2008 года

*(в миллионах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статей | Символ | Пункт примечаний | На 01.10.2008 | На 01.10.2007 |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 271199,2 | 178185,0 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 181886,6 | 103271,2 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 18 | 89312,6 | 74913,8 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 137658,5 | 96801,5 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 32200,1 | 18856,5 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 19 | 105458,4 | 77945,0 |
| 7 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 203 | 20 | 49874,7 | 22668,7 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 21 | 19,0 | -20,5 |
| 9 | Доход в форме дивидендов | 205 | | 42,9 | 404,0 |
| 10 | Чистые отчисления в резервы | 206 | 22 | 2834,0 | 2064,5 |
| 11 | Прочие доходы | 207 | 23 | 9439,8 | 5871,7 |
| 12 | Операционные расходы | 208 | 24 | 140199,2 | 107329,0 |
| 13 | Прочие расходы | 209 | 25 | 20411,8 | 4644,6 |
| 14 | Налог на прибыль | 210 | | 23282,7 | 16603,3 |
| 15 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | | 67419,7 | 51141,3 |

**Генеральный директор** **Г. П. Кухоренко**

**Главный бухгалтер** **А. В. Борейко**

Лицензия Национального банка Республики Беларусь № 4 от 11.07.2007 года на осуществление банковской деятельности. УНП 100219673

*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 15.10.2008 г. (для б/н разлікаў)*

| | |
|---|---|
| 1 долар ЗША | 2 114,00 |
| 1 еўра | 2 889,42 |
| 1 латвійскі лат | 4 075,57 |
| 1 літоўскі літ | 836,33 |
| 1 чэшская крона | 117,16 |
| 1 польскі злоты | 828,21 |
| 1 расійскі рубель | 81,04 |
| 1 украінская грыўня | 410,09 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў*

Цэнтрабанк РФ

| | |
|---|---|
| USD | 26,0871 |
| 10 UAH | 49,6897 |
| 1000 BYR | 12,3431 |
| EUR | 35,6063 |

*Курс у гандлёвых кампаніях (на 14.10.2008 г.)*

| | |
|---|---|
| USD | 2135 / 2210 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова


*Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.*

*ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009*


ISSN 1990 - 763X

# МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

15 кастрычніка 2008 г.
№ 39 (142)


КАРЦІНКІ З НАТУРЫ

# АЎТАКРАМА... ЯК ФАКТАР КАМУНІКАЦЫЙ

**Сцяпанкаўскі сельсавет — паўночная тэрыторыя Жабінкаўскага раёна. У маляўнічых мясцінах паміж лясамі, рэчкамі, азярцамі раскідана сямнаццаць вёсак. На жаль, большасць з іх аджываюць свой век. У Горках, Хмелеўцы, Лойках, Меляшах, Селішчах засталося па пяць-шэсць жыхароў.**

Рэгулярна наведваюцца ў гэтыя населеныя пункты толькі паштальён ды аўтакрама. Зімой колькасць жыхароў названых вёсак яшчэ больш скарачаецца, бо некаторых забіраюць дзеці ў горад. І тады вёсачкі становяцца зусім малалюднымі, да аўтакрамы ля чыёй-небудзь хаты збіраецца яшчэ менш пакупнікоў. Для іх, апошніх жыхароў сваёй вёскі, паход да аўтакрамы — найважнейшая падзея двух-трох дзён (у залежнасці ад таго, як часта заходзіць у вёску магазін на колах). Бабулькі і дзядулькі звычайна сыходзяцца задоўга да вызначанага часу, каб убачыцца, абмяняцца нейкімі навінамі, пагаварыць пра свае старэчыя справы, абмеркаваць палітычныя падзеі і дасягненні медыцыны ў галіне барацьбы з асобнымі хваробамі. Такім чынам, аўтакрамы становяцца не толькі сродкам аказання гандлёвых паслуг, але і фактарам, які спрыяе камунікацыі. Апошнім часам аўтакрамы ходзяць у маленькія вёсачкі спраўна, і на іх асартымент сельскія жыхары не наракаюць. Прывозяць не толькі хлеб і каўбасу, але і ўвесь пералік малочных тавараў і амаль усё тое, што ёсць сёння на паліцах вясковых крамаў.

Магазінаў на тэрыторыі сельсавета засталося чатыры: у Сцяпанках, Арэпічах, Грабаўцах і Вярхах. І ўсяго толькі адна школа. Дырэктар Арэпіцкай школы-садка Ларыса Радкевіч паказвае, які рамонт робіцца ў школе. Пасля яго, несумненна, памяшканне стане яшчэ больш светлым і ўтульным. Школе сёлета спаўняецца 110 гадоў. Адукацыя ў Арэпічах пачыналася з царкоўна-прыхадской установы. Затым была пачатковая, сямігодка, з 1946 года — сярэдняя. А цяпер вось засталася пачатковая і адна група дашкольнікаў. У гэтай школе ёсць усё: класы і пакоі для гульняў, спорту і розных заняткаў па інтарэсах, ёсць музей земляка-настаўніка Цімафея Лася. Але амаль няма дзяцей. У чатырох класах школы і дзіцячым садку засталося 20 выхаванцаў. Таму школа дажывае апошні свой навучальны год. «Гэта пытанне, можна сказаць, вырашана на раённым узроўні, — расказвае сакратар сельвыканкама Галіна Буцько. — Усе ўмовы для таго, каб падвозіць дзяцей у іншыя школы, ёсць. З нашых вёсак, у тым ліку з Арэпічаў, старэйшых школьнікаў возяць у Крыўлянскую сярэднюю школу. Вядома, бацькам зручней, калі дзеці наведваюць школу і садок побач з домам, але ж утрымліваць школу, у якой менш за два дзясяткі дзяцей — вялікая раскоша. І як паказвае практыка, у прыватнасці мая асабістая, у вялікіх школах патрабаванні да вучняў прад'яўляюцца большыя, там яны атрымліваюць больш трывалыя і якасныя веды, асабліва патрэбныя для паступлення ў вышэйшыя навучальныя ўстановы. Так і тлумачым бацькам, калі яны звяртаюцца ў сельскі Савет з просьбамі пакінуць нашу школу».

### Наведвальнікі як яны ёсць

За паўгадзіны, пакуль давялося чакаць старшыню Савета, які ад'ехаў з прадстаўніком прыродаахоўнай установы паглядзець звалку бытавых адходаў, да сакратара зазірнула некалькі наведвальнікаў. Праблемы былі звычайныя, найбольш людзі прасілі даць тую ці іншую даведку. Галіна Паўлаўна цярпліва тлумачыла гарадской жыхарцы, што правілы атрымання даведак аб часовым пражыванні ў сельскай мясцовасці памяняліся.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)*

ФОРС-МАЖОР

# «ЗОНА БЕДСТВАЎ» НА ПАРНІКОВАЙ

***Амаль дзевяць гадоў жыхары дзевяціпавярховага дома вядуць перапіску з адказнымі асобамі і чыноўнікамі***




**Калі ў 1998 годзе Бачкаровы пераехалі ў новую трохпакаёвую кватэру па вуліцы Парніковай, 11, што ў Мінску, іх радасці не было межаў. (Доўгі час да гэтага сям'я з чатырох чалавек жыла ў невялікім пакоі — маці, бацька і дзве дачкі, адна з якіх, Лена, мела II ступень інваліднасці). Нарэшце, у дзяўчатак з'явілася свая «тэрыторыя», свой стол, свая шафа...**



Перапіска з чыноўнікамі не ўмяшчаецца ў руках.

Мама сямейства Людміла, занятая звязанымі з пераездам прыемнымі клопатамі, не адразу заўважыла, што знізу, ад падлогі, сцены новых пакояў пачалі чарнець і пакрывацца плесняй. А заўважыла — не надала значэння. Зіму перазімавалі, а потым пачалося... Шпалеры ўздуліся і пакрыліся бурымі разводамі, плітка ў прыбіральні і ванным пакоі адстала ад сцен, з-за павышанай вільгаці са столі кавалкамі адвальвалася пабелка. Больш за тое — у кватэры № 68, дзе жылі Бачкаровы (і ў іншых, размешчаных на першым паверсе), перыядычна пачаў з'яўляцца едкі пах каналізацыйных нечыстот... Пасля звароту ў ЖЭС № 86, на балансе якога знаходзіўся дом на Парніковай, высветлілася, што невыносны «водар» мае цалкам рэальную прычыну — падвал дома з зайздроснай рэгулярнасцю затапляюць каналізацыйныя масы. Некаторым жыхарам першага паверха «пашанцавала» больш за іншых: нечыстоты «прарываліся» наверх, кватэры затапляла па шчыкалатку, брудная жыжа прасочвалася пад плінтусы і лінолеум.

Каб такое здарылася аднойчы, гэта яшчэ можна было б перажыць. Але прывыкнуць да рэгулярных «сюрпрызаў» людзі былі ўжо не ў стане.

...А ў Людмілы Бачкаровай пачала пастаянна прастуджвацца малодшая дачка, арганізм якой і без таго быў аслаблены цяжкім анкалагічным захворваннем. У адной чвэрці Лена хадзіла ў школу 4 дні, у другой — 7 дзён... Анколагі праверылі яе што называецца «ўздоўж і ўпоперак» і прыйшлі да высновы, што пралечанае анказахворванне не з'яўляецца асноўнай прычынай такога стану дзяўчынкі. Параілі звярнуцца да мікрабіёлагаў. Спецыялісты з Інстытута мікрабіялогіі НАН Беларусі абследавалі некалькі кватэр, зрабілі саскрэб са сценак і іншых «падазроных» месцаў і вынеслі вердыкт: у кватэры № 68 крытычна высокі ўзровень паражэння спорамі мікраскапічных плесневых грыбоў, якія вельмі небяспечныя для здароўя людзей (правакуюць захворванні групы мікозаў, мікатычныя алергіі). Асабліва гэта небяспечна для хворых на анкалогію, паколькі іх імунітэт і так вельмі аслаблены. Пры дадатковым абследаванні ў крыві Лены выявілі той самы грыбок.



Сям'я Таццяны МЕДЗВЯДЗЬ (шасцёра дзяцей) даўно чакае работнікаў ЖЭСа.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.



Людміла БАЧКАРОВА дыманструе адсутнасць дзвярэй.

Спецыялісты інстытута мікрабіялогіі ў лісце, накіраваным начальніку ЖЭС-86 Першамайскага раёна, парэкамендавалі ў тэрміновым парадку зняць у кватэры лінолеум і замяніць яго на драўлянае пакрыццё. А таксама паклеіць у пакоях шпалеры з высокай гіграскапічнасцю, **папярэдне апрацаваўшы сцены спецыяльным біяцыдным саставам.** Было ўказана на неабходнасць уцяплення кватэры № 68 і прывядзення ў належны стан вентыляцыйнай сістэмы.

— Гэтыя рэкамендацыі павінны былі выконваць ЖЭС-86 і ЖРЭА Першамайскага раёна, — расказвае Людміла Бачкарова. — Але да сваіх непасрэдных абавязкаў работнікі гэтых структур аднесліся так, што нам, жыхарам, стала, мякка кажучы, нявесела.

Людміла Мікалаеўна водзіць мяне па сваіх «апартаментах», дэманструючы ўсе «радасці» пражывання на першым паверсе дома № 11 па Парніковай.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)*

МАЛЫЯ ГАРАДЫ

# ДЗЕ ЎМОВЫ, ТАМ І ІНВЕСТАР

**Увагу бізнэсменаў прыцягваюць прэферэнцыі, якія прадастаўляе беларуская дзяржава для рэалізацыі праектаў у малых гарадах і населеных пунктах.**

### *Не ў сталіцу, а ў райцэнтр*

На міжнародным інвестыцыйным форуме «Магілёўская вобласць — тэрыторыя адкрытага супрацоўніцтва», які днямі прайшоў у Магілёве, арганізавалі асобную секцыю: «Малыя гарады — вялікія магчымасці».

— Весці бізнэс у малых гарадах больш выгадна, чым у Магілёве і Бабруйску, — запэўніў старшыня камітэта эканомікі Магілёўскага аблвыканкама Мікалай Дудзінскі, які вёў секцыю малых гарадоў. — Сёння ў нашых малых гарадах працуюць 900 камерцыйных арганізацый і 6000 індывідуальных прадпрымальнікаў.

Намеснік міністра эканомікі Беларусі Андрэй Тур расказаў пра Дзяржаўную праграму развіцця малых гарадоў. Яна, як вядома, распаўсюджваецца на амаль што дзве сотні невялікіх гарадоў. Паводле праграмы, ажыццявяцца больш за тысячу інвестыцыйных праектаў на суму больш за 2,5 мільярда долараў.

Для таго, каб гэтыя грандыёзныя планы спраўдзіліся, беларускі ўрад стварае адпаведныя ўмовы: спрашчае рэгістрацыю новых прадпрыемстваў, сістэму ліцэнзавання і падаткаабкладання. Для тых, хто працуе ў малых гарадах, ёсць асобыя прэферэнцыі. Менавіта яны адыгралі галоўную ролю ў выбары расійскай фірмы, якая сабралася пабудаваць у Беларусі завод па вырабе газасілікатных блокаў. Кошт праекта — 20 мільёнаў долараў.

— Нашы маркетолагі вывучалі магчымасці для пабудовы і працы прадпрыемства «Прамсілікат» у Мінску і Брэсце, але спыніліся на раённым цэнтры Клімавічы, — пацвердзіў дырэктар фірмы «Славушка» Аляксандр Краўцоў. — Таму што тут нас вызваляюць ад шэрагу істотных падаткаў, якія ў вялікіх гарадах б'юць па кішэні інвестара. Акрамя гэтага, мы будзем самі вызначаць заробкі работнікаў, кошт выробленага тавару і рынкі збыту. Усё гэта аддаюць на водкуп вытворцы.

### *Каўбаса з Быхава, піва з Кіраўска*

Старшыня Быхаўскага райвыканкама Мікалай Кароцін расказаў, што асноўнай базай для прыцягнення інвестараў стала маёмасць у былым ваенным гарадку ў Быхаве. І сёння ўжо 27 працэнтаў бюджэту райцэнтра забяспечваецца прыватнымі прадпрыемствамі. Самае буйное з іх — завод па перапрацоўцы мясной прадукцыі «Белатміт» — калісьці пачалося са сціплага памяшкання былой вайсковай сталовай. Цяпер на ім працуюць больш за 600 быхаўчан.

— Удзел у інвестыцыйным форуме для нас быў важны, — Мікалай Кароцін перабірае візітоўкі патэнцыйных інвестараў. — Ужо ў першы дзень тры прадпрымальнікі выказалі жаданне працаваць у нашым раёне. Мяркуецца арганізаваць вытворчасць мяккай мэблі і прадпрыемства па металаапрацоўцы. Яшчэ адзін замежны інвестар плануе заняцца вырабам і перапрацоўкай сельскагаспадарчай прадукцыі. Мы рады новым партнёрам: сёлета ў Быхаўскім раёне ўжо арганізаваны 32 новыя прадпрыемствы!

Патэнцыйныя магчымасці ўкладання капіталу ў выгадныя справы прадэманстраваў і Кіраўскі раён. Старшыня райвыканкама Уладзімір Пяскіжаў расказаў пра канкрэтныя праекты — ільнаводства, харчовая прамысловасць (пашырэнне каўбаснай вытворчасці і кандытарскага цэха), асфальтавы і вінаробны заводы.

— Напрыклад, у вядомай гаспадарцы «Рассвет» ёсць піваварня, якая цяпер закансервавана, — расказаў кіраўнік раёна на секцыі малых гарадоў. — Побач — недабудаванае кафэ на 50 месцаў. Выгадная справа. Тым больш што ў Кіраўскім раёне цяпер вырошчваецца піваварны ячмень. Наладжванне вытворчасці ацэньваецца прыкладна ў 900 тысяч долараў.

Кіраўскі раён таксама прапануе і праекты ў сферы адпачынку і турызму. Адзін з іх — у межах вядомага палаца-паркавага ансамбля ў Жылічах, архітэктурнага помніка. Пачалася рэстаўрацыя палаца, і Жылічы ўвойдуць у турыстычны маршрут рэспубліканскага значэння. А прадпрымальнікам прапануюць у былых падсобных памяшканнях арганізаваць кафэ і гатэль.

### *Замежнікі назіраюць...*

У інвестыцыйным форуме ў Магілёве бралі ўдзел прадстаўнікі больш за дзясятак краін — не толькі бізнэсмены, але і дыпламаты. Дарадца-пасланнік Пасольства Венесуэлы ў Беларусі Сесар Рамос Седзенья не выключае магчымасць стварэння сумесных прадпрыемстваў у рэгіёнах, дзе ёсць прыродныя рэсурсы.

Прадстаўнікі пасольства КНР у Беларусі цікавяцца інфармацыяй пра інвестыцыйны клімат ва ўсіх рэгіёнах Беларусі — потым яна распаўсюджваецца сярод кітайскіх прамыслоўцаў і прадпрымальнікаў. Тавараварот паміж Беларуссю і Кітаем год ад году павялічваецца, і расце цікавасць да сумесных праектаў.

— У Магілёўскай вобласці кітайскае прадпрыемства будзе браць удзел у рэканструкцыі цэментнага завода, — паведаміў дарадца па гандлёва-эканамічных пытаннях Пасольства КНР Юй Сюйсінь.

**Продавец недвижимого имущества:** Отдел по физической культуре, спорту и туризму Несвижского районного исполнительного комитета, расположенного по адресу: Минская область, г. Несвиж, ул. К. Маркса, 36а, тел. (801770) 53078.

**Арендодатель земельного участка:** Несвижский районный исполнительный комитет, расположен по адресу: г. Несвиж, ул. Советская, 1.

**К участию в аукционных торгах допускаются:** юридические лица, индивидуальные предприниматели, граждане Республики Беларусь и иностранные граждане, представившие в фонд «Минскоблгосимущество» в сроки, указанные в извещении, следующие документы:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), нотариально удостоверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации, также представитель должен иметь при себе паспорт или иной документ, удостоверяющий личность;

индивидуальным предпринимателем – нотариально удостоверенная копия свидетельства о государственной регистрации, представителем индивидуального предпринимателя дополнительно представляется нотариально удостоверенная доверенность;

иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, представителем иностранного юридического лица дополнительно представляется легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, а также паспорт или иной документ, удостоверяющий личность;

гражданином Республики Беларусь и иностранным гражданином – паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, представителем гражданина Республики Беларусь и иностранного гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

**ПОБЕДИТЕЛЬ ОБЯЗАН:**

1. В течение 10 рабочих дней со дня принятия Несвижским райисполкомом решения о представлении победителю аукциона земельного участка возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, а также расходы, связанные с формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией создания земельного участка.

2. Внести плату, взимаемую за право заключения договора аренды.

После совершения победителем аукциона действий, названных в пунктах 1, 2, но не позднее 2 рабочих дней, с ним в установленном порядке Продавцом имущества заключается договор купли-продажи недвижимого имущества, а Арендодателем земельного участка – договор аренды земельного участка.

Порядок проведения аукциона определен в соответствии с «Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462.

Фонд «Минскоблгосимущество» (организатор аукциона) имеет право снять предмет аукциона в любой момент до даты проведения аукциона.

Все **расчеты по сумме задатка** производятся путем перечисления их на расчетный **счет фонда «Минскоблгосимущество» № 3642000000028 в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, код 795, ул. Мясникова, 32, УНН 100128686.**

***Заявки на участие в аукционе принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 312, тел. 224 57 09***
***Последний день подачи заявок 14 ноября 2008 г. до 13.00.***

# БЕЛАРУСБАНК

## ОФИЦИАЛЬНАЯ ТАБЛИЦА

Шестьдесят девятого тиража выигрышей по выигрышным вкладам в белорусских рублях, состоявшегося 09 апреля 2008 г. в г. Минске.

Выигрыши выпали на следующие номера счетов по выигрышным вкладам во всех учреждениях ОАО «Акционерный Сберегательный банк «Беларусбанк»:

| Номера счетов | Размер выигрыша в процентах к средней сумме остатка вклада | Номера счетов | Размер выигрыша в процентах к средней сумме остатка вклада |
|---|---|---|---|
| А017 | 112 (Сто двенадцать) | А536 | 112 (Сто двенадцать) |
| А058 | 112 (Сто двенадцать) | А590 | 450 (Четыреста пятьдесят) |
| А113 | 900 (Девятьсот) | А607 | 112 (Сто двенадцать) |
| А158 | 112 (Сто двенадцать) | А657 | 112 (Сто двенадцать) |
| А171 | 225 (Двести двадцать пять) | А685 | 112 (Сто двенадцать) |
| А232 | 225 (Двести двадцать пять) | А731 | 112 (Сто двенадцать) |
| А258 | 112 (Сто двенадцать) | А769 | 112 (Сто двенадцать) |
| А319 | 112 (Сто двенадцать) | А838 | 112 (Сто двенадцать) |
| А328 | 112 (Сто двенадцать) | А875 | 112 (Сто двенадцать) |
| А398 | 112 (Сто двенадцать) | А913 | 112 (Сто двенадцать) |
| А431 | 450 (Четыреста пятьдесят) | А947 | 112 (Сто двенадцать) |
| А454 | 112 (Сто двенадцать) | А988 | 112 (Сто двенадцать) |
| А492 | 112 (Сто двенадцать) | — | |

В учреждениях ОАО «АСБ Беларусбанк», где число счетов более одной тысячи, во всех последующих тысячах выиграли те же номера, что и в первой тысяче, т.е. за №№ А017, А1017, А2017 и т.д.

**Председатель комиссии:** Петкевич Станислав Филицианович — первый заместитель главы Администрации Октябрьского района г. Минска

**Ответственный секретарь:** Ясинская Татьяна Александровна — заместитель директора департамента розничного бизнеса ОАО «АСБ Беларусбанк»

*Свидетельство о государственной регистрации Министерства торговли Республики Беларусь № 1190 от 30.09.2008 г.*

**Проценты, выплаченные по вкладам, депозитам в течение 2007 г., млн. белорусских рублей**

| | январь | февраль | март | апрель | май | июнь | июль | август | сентябрь | октябрь | ноябрь | декабрь | 2007 г. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Вклады до востребования | 20,3 | 62,4 | 149,7 | 238,4 | 148,6 | 193,3 | 202,6 | 233,2 | 244,1 | 365,5 | 397,0 | 29 577,5 | 31 832,6 |
| в том числе: в белорусских рублях | 19,4 | 59,3 | 146,3 | 234,1 | 142,4 | 187,7 | 196,5 | 222,2 | 237,7 | 355,5 | 388,0 | 29 408,3 | 31 597,5 |
| в иностранной валюте | 0,9 | 3,1 | 3,4 | 4,3 | 6,2 | 5,6 | 6,1 | 11,0 | 6,4 | 10,0 | 9,0 | 169,2 | 235,1 |
| Срочные депозиты | 30 358,5 | 32 352,4 | 24 405,4 | 38 746,0 | 48 555,5 | 31 125,0 | 54 036,6 | 38 911,9 | 30 223,7 | 55 111,0 | 42 713,9 | 52 150,6 | 478 690,4 |
| в том числе: в белорусских рублях | 26 895,8 | 28 068,5 | 20 038,5 | 29 455,9 | 42 531,2 | 25 248,9 | 42 908,6 | 32 018,1 | 23 385,1 | 42 826,4 | 34 573,9 | 35 011,8 | 382 962,8 |
| в иностранной валюте | 3 462,7 | 4 283,9 | 4 366,9 | 9 290,1 | 6 024,3 | 5 876,1 | 11 128,0 | 6 893,8 | 6 838,6 | 12 284,6 | 8 140,0 | 17 138,8 | 95 727,6 |

Сохранность и возврат вкладов гарантируется в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь.

*Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 28.08.2008 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.*


# Арганізацыя медыцынскага абслугоўвання ў сталіцы крыху палепшылася

**Такую выснову можна зрабіць, параўнаўшы вынікі сацыялагічных апытанняў, праведзеных супрацоўнікамі Мінскага НДІ сацыяльна-эканамічных праблем у чэрвені 2008-га і лістападзе 2007 года. Усяго апыталі 1200 чалавек ва ўсіх адміністрацыйных раёнах горада.**

Аналіз даных паказаў, што колькасць мінчан, якія сутыкнуліся з адмовай у шпіталізацыі як пры самастойным звароце, так і па накіраванні ўрача, зменшылася з 15,3 да 12,9 працэнта. Прычым часцей адмову ў шпіталізацыі мінчане атрымлівалі, калі звярталіся ў бальніцу самі. У той жа час з 11,1 да 13,8 працэнта вырасла колькасць грамадзян, якія, паводле іх слоў, сутыкнуліся з адмовай у прыёме ўчастковым тэрапеўтам пры высокай тэмпературы, павышаным артэрыяльным ціску, вострым болі.

Пры вывучэнні праблем, якія ўзнікаюць у мінчан пры звароце ў хуткую дапамогу, высветлілася, што ў 7 працэнтаў, па іх словах, былі выпадкі адмовы ў прыняцці выкліку, яшчэ ў 4,8 працэнта — у аказанні медыцынскай дапамогі. Гэта крыху больш, чым у лістападзе мінулага года, канстатуюць даследчыкі.

Але больш за ўсё прэтэнзій гараджане па-ранейшаму прад'яўляюць медперсаналу і адсутнасці ў лячэбных установах высокаэфектыўных лекаў, хоць колькасць такіх адказаў крыху зменшылася. З няўважлівасцю медыцынскіх работнікаў сёлета сутыкнуўся 51 працэнт апытаных мінчан. Летась — 61,4 працэнта. Крыху палепшылася сітуацыя з забеспячэннем паліклінік і бальніц Мінска медыкаментамі. У чэрвені 2008 года з падобнай праблемай сутыкнуліся 41,5 працэнта рэспандэнтаў, у лістападзе 2007-га — 43,1 працэнта.

**Святлана ФРАЛЯНКОВА, «Мінск—Навіны».**

# Пайшла піратэхніка...

**На мяжы ўжо адчуваецца набліжэнне новага года: брэсцкія памежнікі затрымалі першую буйную партыю піратэхнічных прыстасаванняў.**

Паводле звестак прэс-цэнтра Дзяржаўнага пагранкамітэта, у Маларыцкім раёне за 400 метраў ад дзяржаўнай мяжы быў знойдзены ГАЗ-53. Праўда, вадзіцель супрацоўнікам пагранічнага нараду так і не паказаўся. Падчас агляду высветлілася, што кузаў аўтамабіля быў на дзве трэці забіты піратэхнікай кітайскай вытворчасці. Вырашаецца пытанне аб перадачы аўтамабіля з грузам мытным органам.

**Ігар ГРЫШЫН.**

# Укралі і разабралі

**Жыхар з вул. Брэсцкай, што ў Баранавічах, пакінуў «Аўдзі-100» начаваць каля свайго дома. А калі раніцай убачыў, што аўтамабіля няма, то звярнуўся ў міліцыю.**

Легкавушку знайшлі праз суткі на хутары каля в. Цешаўля. «Аўдзі» разабралі па максімуму — знялі дзверы, бампер, карбюратар, пярэднія крылы...

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

# Неасцярожна пакурыў...

**Учора ў Жодзіне выратавальнікі-пажарныя ліквідавалі пажар у трохпакаёвай кватэры ў дзевяціпавярховым доме і выратавалі двух мужчын.**

Як расказалі ў Мінскім абласным упраўленні МНС, адзін з іх неасцярожна пакурыў, ад кінутай цыгарэты загарэўся матрац, бялізна ў ложку. Падраздзяленні МНС выклікалі суседзі, якія адчулі пах дыму. Курэц атрымаў апёкі другой ступені кісці рукі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## Усміхнёмся!

— Што вас цікавіць, жанчына?
— Дзіцячыя каляскі.
— Калі вы хочаце, каб з дзіцем часцей гуляў муж, тады вазьміце вось гэтую, з попельніцай і адкрывачкай для піва.

☺

**Кажуць, сапернік Мікалая Валуева здолеў пратрымацца 12 раўндаў, перш чым яго выпхнулі на рынг.**

☺

— Вось вам таблеткі.
— Я іх піць не буду.
— Чаму?
— У мяне ад вашых таблетак бальнічны хутка заканчваецца!

☺

**У жанчыны павінны быць прыгожымі і душа, і думкі, і ўсё тое, пра што вы зараз падумалі...**

☺

У цырульні:
— Патрасіце, калі ласка, галавой: я туды ўпусціў нажніцы!





# ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ

**по продаже государственного имущества и права заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества**

| Наименование предмета аукциона | Здание столовой с сооружениями и право заключения договора аренды земельного участка | Здание аккумуляторной и право заключения договора аренды земельного участка |
|---|---|---|
| Местонахождение недвижимого имущества | г. Барановичи, ул. Брестская, 182 | Брестская обл., г. Лунинец, ул. Баженовой, 6б |
| Продавец недвижимого имущества | ТРУП «Барановичское отделение Белорусской железной дороги», г. Барановичи, ул. Фроленкова, 54, тел. 8016349 33 46 | РУДТП «Автомобильный парк № 10 г. Лунинца», тел. (01647) 2 28 54, 2 10 08 |
| Сведения о предмете аукциона | Здание столовой с блочным подвалом, блочной и дощатой холодными пристройками, 1-этажное, 1969 г.п., стены и перегородки кирпичные, крыша рулонная совмещенная, площадь – 367,2 кв.м; здание склада 1969 г.п., стены и перегородки кирпичные, крыша шиферная, площадь – 75,3 кв.м; сооружение неустановленного назначения (бордюрный камень и бетонная плитка, площадь 424 кв.м), сети тепло- и водоснабжения, канализации. Земельный участок площадью 0,1390 га, для размещения объекта общественного питания, торговли, административного назначения, срок аренды – 50 лет. | Здание одноэтажное с холодной пристройкой, 1978 г.п., площадь – 100 кв.м. Земельный участок площадью 0,1200 га с ограничениями в использовании земель на площади 0,0230 в охранной зоне линии электропередачи использовать для организации производства, общественного питания, торговли, бытовых услуг; срок аренды – 99 лет. |
| Начальная цена предмета аукциона, руб. | 139 110 370 | 22 442 260 |
| Сумма задатка, руб. | 13 911 000 | 2 244 000 |
| Организатор аукциона | *Фонд «Брестоблимущество», г. Брест, ул. Ленина, 11, тел. (0162) 20 87 85, 23 12 63 , 23 44 06, www.brest-region.by* | |

Аукцион состоится **18 ноября 2008 года** в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 524 (здание облисполкома).

**Для участия в аукционе представляются:**

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение с фондом «Брестоблимущество».
2. Заверенные банком копии платежных поручений:
- о внесении суммы задатка на р/с 3642202530011 Головной филиал по Брестской области ОАО «Белинвестбанк», код банка 823, получатель платежа – фонд «Брестоблимущество», УНН 200020538;
- о внесении специального сбора за подачу заявления на участие в аукционе в размере 4 базовых величин и платы за регистрацию участников аукциона в размере 0,5 базовой величины на р/с 3600201000015 филиал № 100 ОУ ОАО «СБ «Беларусбанк», код 246, назначение платежа 03107, УНН 200300543, получатель платежа – финансовое управление Брестского облисполкома.
3. Юридическим лицом – доверенность представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), нотариально удостоверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица.
4. Индивидуальным предпринимателем – нотариально удостоверенная копия свидетельства о государственной регистрации.
5. Иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.
6. Представителем иностранного юридического лица или иностранного гражданина, лица без гражданства – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.
7. Представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность.
8. При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, представители иностранных инвесторов предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержд. постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.

Участник, ставший победителем аукциона, обязан: подписать протокол аукциона; в течение 10 рабочих дней со дня принятия местным исполнительным комитетом решения о предоставлении земельного участка: внести плату за право заключения договора аренды земельного участка (часть платы в случае рассрочки), возместить расходы по формированию и регистрации земельного участка и расходы на подготовку и проведение аукциона, после чего не позднее 2 рабочих дней заключить с продавцом недвижимого имущества договор купли-продажи недвижимого имущества, а с местным исполнительным комитетом договор аренды земельного участка.

***Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 405, 404, фонд «Брестоблимущество» с 8.30 до 17.30 по рабочим дням по 17 ноября 2008 года включительно.***


«ШТО Ў ВАС ДОБРАГА?»

# У ЧОРНАЙ ПАЛАСЕ ПРЫКМЯЧАЮ БЕЛЫЯ ПЛЯМЫ

***Таццяна КРАСНАПОЛЬСКАЯ, вядучая навін на «Альфа-радыё»:***

«На гэты раз у Бараўляны я ездзіла з начоўкай. Адной маці трэба было неадкладна з'ездзіць дадому. А хворую дачку не было на каго пакінуць.

Ездзіць у дзіцячы анкацэнтр раз на тыдзень, каб дапамагаць бавіць час — гэта адно. А вось жыць там, карміць, даглядаць, вадзіць, праходзіць працэдуры, забаўляць, вучыць смяяцца, размаўляць, здагадвацца, назіраць адну і тую ж карціну з акна... гэта зусім іншае.

Мы з К. пагулялі ва ўсемагчымыя пісьмовыя і вусныя гульні (у рухомыя К. пакуль не можа). Было так весела, што мы смяяліся да слёз.

Уначы я двойчы падхапілася: баялася праспаць сняданак К.

Я гатавала ёй сняданак, у прамежках фарбуючы вочы. Я, ненавідзячая гатаваць, упершыню рабіла гэта з задавальненнем і любоўю. А яе ванітавала. Сняданак застаўся некранутым. На працэдуры мы пайшлі павольна і галодныя.

А працэдура наступная. Зайсці ў працэдурку, легчы на стол, дачакацца доктара. Скальпель. Нажніцы. Два швы. К. прасіла, каб я сядзела ля дзвярэй і нікуды не сыходзіла. А сама, лежачы на стале, смяшыла доктара.

На працэдурах бачыш тое, чаго ніколі не ўбачыш у пакоі для гульні за партыяй лато. Там быццам бы іншыя дзеці. Ніколі не здагадаешся, што яны перанеслі да твайго прыходу і што яшчэ перанясуць на заўтрашніх працэдурах.

Увечары прыехала маці, расцалавала нас і з нязменным энтузіязмам пачала расказваць, як жывуць сваякі. К. ужо больш за год не была дома.

Я разбітым карытам паўзла да аўтобуса. А яны, упэўнена, яшчэ пару разоў згулялі ў гарады.

Затое цяпер я дакладна ведаю, што ім патрэбна мая (нематэрыяльная) дапамога. Калі яны не паглядзяць лішні раз у адно і тое ж акно, я гатова кожны вечар гуляць у лато».

***Эдуард ЛІПЕНЬ, урач анестэзіёлаг-рэаніматолаг:***

«Па-першае, мне не прадоўжылі кантракт (я працаваў выкладчыкам кафедры аховы здароўя БДУ), па-другое, нядаўна трапіў у аўтамабільную катастрофу, па-трэцяе, сярод родных ёсць цяжкахворыя... Але, нягледзячы на гэта, я лічу сябе шчаслівым чалавекам. Бо ў любой чорнай паласе стараюся прыкмячаць белыя плямы. Ну вось, глядзіце: тое, што мяне пазбавілі магчымасці праводзіць заняткі са студэнтамі, не вельмі добра, але я ўжо на пенсіі, прыйшоў час саступіць дарогу маладым. Нягледзячы на стрэс, які я перажыў у аўтакатастрофе, я застаўся жывым і здаровым. За жыццё ж сваёй 96-гадовай цёткі, якая сабралася паміраць, я працягваю змагацца, з такім імпэтам, з якім штодзень змагаюся за жыццё сваіх пацыентаў. Толькі шкада, што не ўсе людзі разумеюць, што доктар у стане вылечыць хворага толькі тады, калі пацыент заадно са сваім урачом, а не з'яўляецца саюзнікам хваробы».

***Міхаіл ЗУЙ, акцёр тэатра імя Янкі Купалы, гітарыст гурта «ДзеціДзяцей»:***



«Не паверыце, але зараз з усіх бакоў мяне акружае добрае *(усміхаецца)*. Ну, напрыклад, восень. Я раней не любіў гэту пару года. А зараз душы ў ёй не чаю. Магчыма, тут справа ў душэўнай гармоніі?.. З'явіўся час для сустрэч з сябрамі (раней за рэпетыцыямі яго чамусьці неставала). Так прыемна зазірнуць у свет дарагога чалавека, падзяліцца сваімі перажываннямі.

Акрамя таго, не так даўно ў гурта «ДзеціДзяцей» быў першы сольны канцэрт у гэтым сезоне. Упершыню канцэрт праходзіў у клубе, таму гледачы маглі танцаваць і адрывацца разам з намі. У чарговы раз адчуў асалоду ад сустрэчы з прыхільнікамі, пераканаўся, як прыемна дарыць са сцэны неабыякавым людзям частку сябе, дзяліцца пазітывам і аптымізмам.

А яшчэ я на днях згубіў плэер. Здаецца, што тут можа быць добрага? Аказваецца, ёсць: зараз я не маю спакусы, ідучы на працу ці гуляючы па горадзе, паслухаць музыку, таму больш часу надаю прыдумванню сваёй. Каб зарадзіць чарговай порцыяй станоўчай энергіі і прыемна здзівіць аматараў на чарговым канцэрце, які, дарэчы, адбудзецца зусім хутка — у першы дзень лістапада».

**Надзея ДРЫЛА.**



# Дзённік бландзінкі

## РОЗНІЦА ЎСПРЫМАННЯ

А вы заўважылі, што +10 вясной — гэта цёпла, а +10 увосень — халодна?

## ЯК ЗАРАБІЦЬ МІЛЬЁН?

Вырашыла сёння купіць печыва.

Даю грошы, называю гатунак і атрымліваю ў запаяным пакецiку нешта, што яўна падгарэла. Колерам яно адрознівалася ад таго, што ляжала на вітрыне, як я ад Вупі Голдберг. Указваю на гэта прадавачцы і прашу замяніць пачак. На што мне гаворыцца, што яно ўсё такое, а на вітрыне проста выгарала. Ад такога дзіўнага адказу я анямела, адышла, думаючы над тым, дзе гандляры знаходзяць цяпер такое сонца... Але роўна праз два крокі зразумела, што ўсё роўна не змагу есці вуглі з пакеціка, развярнулася і папрасіла памяняць мне печыва на другі гатунак з даплатай. Увесь гэты час я была ў полі зроку прадавачкі, але на маю просьбу яна адрэагавала геніяльна. Яна сказала гнеўна:

— Небось уже съела половину!

І кінула пачак — паўтаруся, запаяны! — на вагі, каб праверыць, колькі я змагла з'есці за дзве секунды.

Тут я анямела другі раз... На гэты раз задумаўшыся: нафіга я трачу столькі грошай на дарагія рэчы, калі ўсё роўна выглядаю, як чалавек, які крадзе пячэнькі?.. Пасля мне прыйшло ў галаву, што мне не крыўдзіцца трэба, а браць метад на ўзбраенне. Вымаючы з пачкаў па адной пячэнінцы ў дзень, я змагу зэканоміць за дваццаць дзён на цэлым пачку! Калі выцягваць па адной пельменіне з пачка штодзённа, то за месяц у мяне зноў жа накопіцца цэлы пачак пельменяў. Пару ікрынак, выцягнутых з бляшанкі, дадуць мне ў канцы года цэлую бляшанку!!!

Карацей, уражаная сваімі будучымі эканамічнымі выгодамі, нічога не сказала прадавачцы, хоць у сувязі з тым, што вага пачка супала з напісанымі на этыкетцы паўкілаграмамі, магла б патрабаваць прабачэння з яе боку...

Але не прайшло і дзвюх секундаў, як я была адпомшчаная. У злыдні-прадавачкі ад нялоўкага руху пачкі паляцелі ўніз і паразбіваліся.

Ля-ля-ля-ля...

## ПРА НЕЛЮДЗЯЎ

Вечар, прыцемкі...

Падмерзлыя бабулькі на вакзале каля метро спрабуюць прадаць такія ж падмерзлыя кветкі. Міма ідзе міліцэйскі чын і на хаду, не спыняючыся, гаворыць ім:

— Снова вы тут! И не стыдно? Вы люди или нелюди... с цветами?

«Нелюдзі» з кветкамі разбегліся...

## СЕМ БОСКІХ ДАБРАДЗЕЙНАСЦЯЎ

Здаецца, усе могуць пералічыць сем смяротных грахоў.

Цікава, а ці многія з вас здольныя назваць сем боскіх дабрадзействаў?

Прызнаюся, я была вымушана падглядзець, каб адказаць...

Ці азначае гэта, што дрэннага ў мяне больш, чым добрага?

## ШУКАЙЦЕ ЖАНЧЫНУ!

Гісторыя — адзіная навука, якую не ўспрымаю ўсур'ёз. Нічога больш спекулятыўнага, чым яна, і прыгадаць не магу. Бо як толькі паміраюць апошнія сведкі здарэння, кожны здатны зрабіць з мінулым што заўгодна.

Учора паглядзела чарговую перадачу, дзе распавядалі пра таямніцу смерці Купалы. У такой сучаснай манеры, дзе вылучаецца шмат версій, а аўтар пераконвае, што толькі ён здолеў дазнацца праўду. Не буду казаць, што ведаю, як яно было, але тое, што ў расказаным шмат недарэчнасцяў — дакладна.

Карцінка была такая.

Масква. Гасцініца «Масква». 1942. Купала сядзіць з сябрамі, якія выпіваюць, у гасцінічным нумары. Па версіі вядучага — Купала не п'е. Нехта таямнічы звоніць па тэлефоне. Купала выбягае адзін на калідор. Што адбываецца — невядома. Сведкаў, як неаднойчы падкрэслівае вядучы, няма. Купалу знаходзяць унізе мёртвым, бо зваліўся ў пралёт (праз сапраўды вельмі нізкія парэнчы) і разбіўся. Пасля той жа вядучы гаворыць, што сведкі бачылі двух людзей. Адна з іх — жанчына. Вядучы ўголас думае, што гэта магла быць карэспандэнтка газеты. А пасля намякае, што гэта магла быць і Паўліна Мядзёлка, любімая жанчына Купалы (для тых, хто не ведае, любімай яна была яшчэ да рэвалюцыі, прыблізна каля 1914 года). Пасля версія зводзіцца да «ворганаў» і адносінаў Купалы са Сталіным...

Сюжэт, пакладзены ў перадачу, ужо даўно расцяганы па газетах. Чым больш праходзіць часу са смерці класіка, тым больш забойцаў і таямніцаў. Аднак, прызнаюся, той, хто звязаны з літаратурай, ведае, што яшчэ зусім нядаўна была вядомая іншая гісторыя. Праўда, падрабязнасцямі мала хто мог падзяліцца.

Але ж распавёў пра акалічнасці гэтай трагедыі другі класік беларускай літаратуры — Янка Брыль — у кнізе «Вячэрняе».

І ў мяне няма ніякіх падстаў не верыць Янку Брылю. Менавіта чалавечнасць гэтай версіі пераконвае мяне ў яе праўдзівасці. Але цяпер яе ніхто не хоча згадваць. Няма скандалу — няма праблемы...

## КАЧЫНАЕ ЯЙКА СУПРАЦЬ АДРОННАГА КАЛАЙДАРА

Размаўляю з сястрой па тэлефоне, дакладней, кансультуюся, бо яна добры доктар, са стажам, але без прафесійнага цынізму.

Яна выслухоўвае мяне і кажа:

—Ой, нешта ўсё ў цябе непрыемнасці ды непрыемнасці... Я нават сваіх пацыентак успомніла! Апошнім часам толькі скажу дыягназ, дык яны мне пра КАЧЫНАЕ ЯЙКА расказваюць... Гэта, гавораць, «мыні хтось уробыў!» І пачынаюць пра нейкія яйкі ад качкі — каму іх, быццам бы, у гародзе закапалі, каму ў двор падкінулі...»

Я смяюся, абяцаю пашукаць яйка, і забываю.

А сёння звоніць сястра і пытае: «Помніш тую размову? Дык вось, наняла рабочых — бацькам комін пачысціць... Нагрэблі два вядры, паставілі ў двор... а праз пару гадзін бачым, а там яйка качынае!»

Я смяюся, а яна прадаўжае:

— Вось табе смех, а мне давялося яго выкотваць на скрыжаванне. Гавораць толькі так ад гэтага ліха можна пазбавіцца... Прычым рукой браць нельга. Уяўляеш, дзе дом, а дзе дарога... І каціла!»

Мне смешна:

— Слухай, ты ж урач, у што ты верыш!

— Ды паверыш тут, калі вакол нас і качак даўно няма, апошняе яйка гадоў дзесяць таму бачылі! Ды і бацькоў шкада...

**Ганна КІСЛІЦЫНА.**

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 7.38 | 18.12 | 10.34 |
| Віцебск — | 7.30 | 17.59 | 10.29 |
| Магілёў — | 7.28 | 18.02 | 10.34 |
| Гомель — | 7.22 | 18.01 | 10.39 |
| Гродна — | 7.53 | 18.27 | 10.34 |
| Брэст — | 7.51 | 18.30 | 10.39 |

**Месяц**

***Поўня.***
***Месяц у сузор'і Цяльца.***

**Імяніны**

***Пр.*** *Ганны, Усціны, Андрэя, Давыда, Канстанціна, Касьяна, Купрыяна.*
***К.*** *Тэрэзы, Ядвігі, Леанарда.*




Дзве даты

## 15 кастрычніка

**1984 год** — адбылася першая плаўка на Беларускім металургічным заводзе. Завод заснаваны ў маі 1982 года. Зараз гэта — адно з найбуйнейшых прадпрыемстваў краіны, прадукцыя якога складае аснову экспарту краіны. У спісе гандлёвых партнёраў БМЗ — каля 50 дзяржаў з усіх кантынентаў.



**1814 год** — нарадзіўся Міхаіл Лермантаў, выдатны рускі паэт, аўтар славутых твораў «Смерць паэта», «Барадзіно», рамантычнай драмы «Маскарад», першага ў рускай літаратуры сацыяльна-псіхалагічнага і філасофскага рамана «Герой нашага часу». Творчае жыццё Лермантава працягвалася параўнальна нядоўга — 13 гадоў, але ён заняў адно з першых месцаў у расійскай літаратуры.

Цытата дня:

*«Шукайце ў жанчыны натхнення, але не парады».*

**Дэльфіна дэ Жырардэн (1804—1885), французская пісьменніца.**

# РЭШАТА

Свет і сусвет чалавека

**Рэшата — гаспадарчая прылада для адсеву адходаў і ачышчэння мукі. У народнай культуры славян рэшата сімвалізавала багацце і пладаноснасць, ачышчэнне, такія рысы чалавека як сумленне і праніклівасць. У хрысціянстве рэшата азначала хуткі Божы Суд. Рэшата маглі выкарыстоўваць у самых разнастайных абрадах і рытуалах.**

- Як магічнае ёмішча дарункаў прыроды, рэшата прысутнічала на свяце Багача. У рэшата, якое насіла назву «багач», насыпалі зерне ад апошняга снапа, пасля чаго з ім і грамнічнай свечкай абыходзілі ўсе падворкі — «замыкалі» вёску кругам на доўгую зіму, а затым неслі ў хату гаспадару, які захоўваў «багача» да наступнай восені.
- Часам у народнай культуры рэшата параўноўвалі з небасхілам, аблокамі, праз якія Бог лье ваду ў выглядзе дажджу на зямлю. Таму ў час засухі жанчыны лілі ваду праз рэшата з надзеяй выклікаць доўгачаканы дождж. Каб спыніць працяглыя дажджы, жанчыны хадзілі па вёсцы, заходзілі ў кожную хату, каб перавярнуць рэшата.
- Як рэч, прызначаную для ачышчэння, рэшата выкарыстоўвалі народныя лекары пры лячэнні шматлікіх хваробаў, асабліва сурокаў. Лічылася, што вада, прапушчаная праз рэшата, набывае магічныя здольнасці. Калі дзіця моцна плакала, яго мылі вадой, прапушчанай праз рэшата. Карову пасля ацёлу, а таксама цяля палівалі прапушчанай праз рэшата вадой.

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

# Здарэнне на паляванні

**Пачынаецца паляўнічы сезон, і адначасова ў міліцэйскіх зводках паяўляюцца звесткі аб здарэннях на паляванні.**

Вось і ў мінулыя выхадныя паляўнічыя ў Баранавіцкім раёне дапусцілі няшчасны выпадак. Выпадковы стрэл з паляўнічага ружжа 40-гадовага жыхара Баранавічаў абярнуўся раненнем у нагу для паляўнічага-вяскоўца. Пацярпелы дастаўлены ў бальніцу.

**Яна СВЕТАВА.**

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 7 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 33.350 Індэкс 63850. Зак. № 5677. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12